УДК 37.091.212.2:004.77:378.4(476.2)

# ІНТЭРНЭТ-ТЭСЦІРАВАННЕ Ў ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

**Чайкова С.В., к. філ. н., загадчык кафедры**

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, Рэспубліка Беларусь*

Вядомы лацінскі выраз "*Repetitio est mater studiórum*" гучыць як "Паўтарэнне – маці вучэння". Каб паспяхова справіцца з заданнямі цэнтралізаванага тэсціравання, абітурыентам патрэбна для пачатку яго адрэпеціраваць, а потым прааналізаваць. Важна ведаць, якія памылкі дапуш-чаны, якія тэмы недастаткова засвоены, якія наогул засталіся "белай плямай".

З гэтай мэтай для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення і падрыхтоўчых курсаў факультэта давузаўскай падрыхтоўкі і навучання замежных студэнтаў установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны" прапануецца сістэма дыстанцыйнага навучання Цьютар (*tutor.gsu.by*). Слова *tutor* паходзіць з англійскай мовы і перакладаецца як 'настаўнік'. Гэта гістарычна складзеная асобая педагагічная пасада. Цьютар забяспечвае распрацоўку індывідуальнай адукацыйных праграм навучэнцаў і студэнтаў і суправаджае працэс індывідуалізацыі і індывідуальнай адукацыі ў школе, установе вышэйшай адукацыі, у сістэме дадатковай адукацыі. Сістэма Цьютар ГДУ імя Ф. Скарыны ўключае ў сябе 10 такіх модулей, як "Дадатковае тэсціраванне", "Падрыхтоўчае аддзяленне" (Скрыншот 1), "Кубак ГДУ па тэсціраванні", "Падрыхтоўчыя курсы", "Алімпіядная падрыхтоўка" і інш.




*Цьютар ГДУ імя Ф. Скарыны*

Спынемся падрабязней на першых двух.

Разам з праходжаннем рэпетыцыйнага тэсціравання, якое распрацавана і прапанавана Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў, Цэнтр тэсціравання прапануе ўдзельнікам, якія прайшлі такое тэсціраванне ў нашай установе вышэйшай адукацыі, кансультацыйныя заняткі па некаторых прадметах. Праводзяць кансультацыі па найбольш цяжкіх пытаннях адпаведных дысцыплін, аналізу памылак тэставых заданняў мінулых гадоў кваліфікаваныя выкладчыкі ўніверсітэта, сярод якіх выкладчыкі кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі, якія маюць вопыт работы па падрыхтоўцы слухачоў падрыхтоўчага аддзялення і падрыхтоўчых курсаў да цэнтралізаванага тэсціравання. Акрамя таго, для ўдзельнікаў рэпетыцыйнага тэсціравання прадугледжана дадатковае тэсціраванне праз Інтэрнэт па 11 прадметах (па кожнаму маецца ад 4 да 11 тэстаў, аналагічных тэстам рэпетыцыйнага і цэнтралізаванага тэсціравання).

Раздзел "Падрыхтоўчае аддзяленне" складаецца з 11 рубрык-назваў агульнаадукацыйных прадметаў (па якіх абітурыенты здаюць цэнтралізаванае тэсціраванне), якія выкладчыкамі кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі запаўняюцца тэставымі заданнямі. Тэсціраванне праз Інтэрнэт можа быць як формай кантролю, так і прапануецца для самастойнай работы слухачоў. На дадзены момант многія са слухачоў, якім у пачатку навучальнага года былі выдадзены паролі, выкарысталі магчымасць папрактыкавацца ў выкананні тэстаў і далі станоўчыя водгукі.

У сістэму дыстанцыйнага навучання ўнесены тэсты рознага характару: дыягнастычныя (даюцца ў пачатку навучання), тэматычныя (выконваюцца пасля вывучэння асобных правіл), абагульняльныя (па пэўных раздзелах), заліковыя (за першы семестр і за ўвесь навучальны год).

Аўтарам гэтых радкоў, напрыклад, распрацавана 45 тэстаў па фанетыцы і арфаэпіі, лексікалогіі і фразеалогіі, арфаграфіі, марфалогіі і правапісу часцін мовы, сінтаксісу і пунктуацыі, стылістыцы і культуры маўлення беларускай мовы.

Тэставыя заданні ацэньваюцца ад 1 да 5 балаў у залежнасці ад іх цяжкасці, пры гэтым улічваюцца часткова выкананыя заданні (можа налічвацца адзін бал з двух або два з трох і т. п.).

Станоўчымі бакамі Інтэрнэт-тэсціравання з’яўляецца магчымасць іх выканання ў любы час і ў любым месцы, дзе ёсць камп’ютар або тэлефон з доступам у Інтэрнэт; магчымасць самастойнага выбару паслядоўнасці і тэмпу праходжання тэсту, атрыманне аб’ектыўнай нагляднай ацэнкі ў адсотках (максімум 100%).

На дадзены момант актуальнай для прафесарска-выкладчыцкага саставу кафедры з’яўляецца папаўненне сістэмы “Цьютар” тэставымі заданнямі і размяшчэнне тэарэтычнага матэрыялу, у тым ліку гласарыя (ад лац. *glossarium* – ‘тлумачальны слоўнік’) і каментарыяў да кожнага задання. Каб выканаўца тэстаў не проста бачыў сваю памылку (яна выдзяляецца крыжыкам чырвонага колеру), а меў магчымасць атрымаць тэарэтычны матэрыял або каментарый на няправільна выкананае заданне.

Для самастойнай работы слухачам падрыхтоўчага аддзялення і падрыхтоўчых курсаў прапануюцца размешчаныя на сайце ўніверсітэта электронныя вучэбна-метадычныя комплексы, што змяшчаюць арыгінальныя метадычныя распрацоўкі выкладчыкаў. Разам з прэзентацыямі лекцый, слоўнікамі тэрмінаў, практыкаваннямі і заданнямі ў комплексах размешчаны і шэраг тэстаў. Аднак многія з абітурыентаў аддаюць перавагу камп’ютарнаму выкананню тэставых заданняў (магчыма, адной з прычын з’яўляецца тое, што рэзультат можна ўбачыць адразу пасля выканнання тэста (як гаворыцца, “тут і зараз”).

Такім чынам, у Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны для паспяховага праходжання цэнтралізаванага тэсціравання і ў рамках прафарыентацыйнай работы слухачам падрыхтоўчага аддзялення, падрыхтоўчых курсаў і ўдзельнікам рэпетыцыйнага тэсціравання прапануецца магчымаць праверыць свае веды шляхам дадатковага тэсціравання праз Інтэрнэт па большасці агульнаадукацыйных прадметаў. Сістэма дыстанцыйнай формы навучання пастаянна папаўняецца тэстамі і прэзентацыямі; у планах напаўненне сістэмы тэарэтычным матэрыялам і гласарыям.